УДК (070+94)(476)“15/16”

**Еўмянькоў Віталь Іванавіч**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
krumkach@yandex.by

# НАШЭСЦЕ БУДЖАКСКАЙ АРДЫ Ў 1624 ГОДЗЕ НА ТЭРЫТОРЫЮ ПАЎДНЁВЫХ ВАЯВОДСТВАЎ КАРАЛЕЎСТВА ПОЛЬСКАГА Ў АДЛЮСТРАВАННІ СУЧАСНІКАЎ

Артыкул адлюстроўвае супрацьстаянне Каралеўства Польскага і Буджакскай арды на тэрыторыі сучаснай Украіны.
***Ключавыя словы:*** Рэч Паспалітая, Украіна, арда, сойм, вайна

The article reflects the history of the struggle of the Kingdom of Poland and nomads in the territory of modern Ukraine.
***Keywords:*** Polish-Lithuanian Commonwealth, Ukraine, horde, parliament, war

1624 г. у гісторыі Рэчы Паспалітай застанецца як год татарскага нашэсця. Буджакская арда на чале з Кантымір-мурзой уварвалася на поўдзень сучаснай Украіны, прайшлася агнём і мячом па тэрыторыі, якая сягае аж да памежнага Перамышля. Сучаснікі лічылі Боскім цудам перамогу нешматлікага каралеўскага войска на чале з польным гетманам Станіславам Канецпольскім. Пад Мартынавым гетман не проста “даў поле” татарам, але і ўшчэнт разбіў дасведчанага і небяспечнага ворага. Чэрвеньскім падзеям 1624 г прысвечана шмат згадак у мемуарнай літаратуры. Ёсць звесткі пра “нагайскае нашэсце” і ў неперыядычных выданнях, рэляцыях і дыярыўшах. У прыватнасці, мы маем на ўвазе варшаўскае выданне “Разгром татарскі…”, якое падае дастаткова поўны, праўда, падфарбаваны эмоцыямі невядомага аўтара малюнак тых пад-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зей (POGROM TATARSKI álbo Relátia krotka Zwycięstwa nád Tátárámi. Przez Wielmożneg Iego M. Páná, P. HETMANA Polnego Koronnego.W Roku 1624. Dniá 20. Mieśiąca Czerwcá między Háliczem á Bolszowcem otrzymána. Przydány iest k temu Regestr Ich. M. PP. Voluntáriuszow, y Murzow Tátárskich. W WARSZAWIE, W Drukárni Janá Rossowskiego K. J. M. Typográphá Roku Páńskiego 1624).

"Спадзяваўся яго міласць пан гетман на тое, што вораг, паводле свайго звычаю, меўся спачатку на войска наша ўдарыць, а потым ужо на Падолле рушыць, ды татары не так славы, як здабычы шукалі і наўпрост на Падолле пайшлі", – паведамляе ўлётка. Канецпольскі, які, паводле аўтара, меў пад рукой усяго паўтары тысячы вояў (перадапошняя старонка дакумента падае зусім іншую лічбу войска Канецпольскага: крыху больш за пяць тысяч), не мог дазволіць сабе рушыць услед за ардой "капытом у капыта". Гетман чакаў прыходу каралеўскага войска, але страціў надзею і вырашыў уласнымі сіламі заступіць татарам шлях на пераправе праз Днестр пад Мартынавым. Нарэшце ворагаў раздзяляла толькі рачная плынь. Канецпольскі, як вынікае са зместу дакумента, даў загад адыходзіць у больш спрыяльнае для бітвы месца. Кантымір "<…> пайшоў услед за намі і, убачыўшы колькі вазоў, якія мы наўмысна на дарозе пакінулі, пераканаўся ў нашай палахлівасці. З усім войскам сваім, якога было каля 15 тысяч, саманадзейна а першай гадзіне дня рушыў на нас. Ледзь мы паспелі як след пашыхтавацца" (аркуш 8).

Фактычна, польны гетман апынуўся ў сітуацыі, якая вельмі нагадвала трагічныя падзеі разгрому кароннага войска на ўзбярэжжы Цацоры. Тады ў запеклым баі загінуў вялікі гетман каронны Станіслаў Жалкеўскі, а сам Канецпольскі патрапіў у ганебны палон. Відавочна, што Кантымір жадаў паўтарыць тую перамогу і рашуча абрынуўся спачатку на правае крыло польскага войска, а потым і на цэнтральныя харугвы. Нягледзячы на страты, жаўнеры Рэчы Паспалітай паспяхова абараняліся. "Патрапіў баша на іх мосцяў паноў Сіняўскіх, а таксама на іх мосцяў Трэмбавельскага і Скальскага старастаў. Мужна яны стаялі. З другога боку яго міласць пан Канецпольскі, ваяводзіч Серадзкі, пан Богуш і пан Даджывольскі ўзяліся з ворагам на шаблі" (аркуш 9).

Сказалі сваё слова гарматы, якія добра прарэдзілі татарскія шыхты. Арда тым часам адкацілася назад і бавіла час у гарцах. Гетман аддаў загад усім сваім харугвам ісці наперад. Якім чынам невялікая купка гусараў і пехацінцаў здолела скінуць ворага з высокага берага ў Днестр, аўтар не тлумачыць. Затое падае надзвычай маляўнічае апісанне працэсу знішчэння ардынцаў: "Нашы стралялі ў паганства з рушніц, з лукаў, нібы ў качак, якія па вадзе плаваюць. Адны разам з коньмі танулі, і дужа шмат татарвы, мёртвых язычнікаў, па Днястры плавала. Другія імгненна апускаліся на дно рэчкі і там заставаліся –так, што толькі каўпакі і іншыя рэчы іх хвалі гойдалі" (аркуш 10).

Рашучыя дзеянні каралеўскага войска дапамаглі вызваліць з татарскага палону шматлікіх вязняў і адбіць здабычу. Аўтар так характарызуе колькасць палонных: "незлічоная плынь мужчын і жанчын". "Шмат было ў полі дзяцей –



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

малых і нават немаўляці. Толькі з плачам яны крычалі. Моц была шляхецкіх жанок і дачок. <…> Вялікі плач там быў з радасцю перамяшаны. Людзі, якія ў другі раз на свет нарадзіліся, крыжам перад намі падалі, бласлаўлялі і дзякавалі” (аркуш 12).

Татары ж, паводле аўтара ўлёткі, бессаромна ўцякалі, кідаючы рэчы на шляху. “Кантымір тры разы быў падстрэлены, адзін раз – у галаву. Да таго дайшло, што з дваццаццю вершнікамі па сцежцы вузкай уцякаў. Кажуць таксама, што Кулім бея забілі, бо недабіткі цела яго выратаваць спрабавалі. Загадана было таму нябожчыку галаву адцяць дзеля апазнання. Пахолак яго міласці пана брацлаўскага ваяводзіча тую галаву ноччу ў балоце згубіў” (аркуш 13). Так бясслаўна завяршылася нашэсце Буджакскай арды на каралеўскія землі.

Згодна з традыцыяй усяго “сармацкага” стагоддзя, аўтар улёткі прычыны перамогі выводзіць як з рыцарскай мужнасці, так і з Боскай дапамогі, знак якой нібыта з’явіўся на небе падчас бітвы. Быў гэта вялізны крыж, які ўтварыўся з агню і дыму ўверсе за спінамі ворагаў. “І на тое зважаць таксама варта, што ў дзень Святога Антонія з Падуі Смаленск быў вызвалены, а ў актаве таго свята, то бок 20 чэрвеня, новая перамога над непрыяцелем атрыманая. З тых двух выпадкаў ясна кожны ўбачыць можа тое, што за набожнасць яго каралеўскай міласці Пан Бог, якому вечная слава, выράшыў блаславіць народ наш на перамогу” (аркуш 15).

Яшчэ адзін дакумент, які амаль слова ў слова паўтарае інфармацыю, выкладзеную ў “Разгроме татарскім…”, называецца “Дыярыўш праўдзівы перамогі над тарамі…” (Dyaryusz prawdziwy zwycięstwa nad tatarami otrzymanego roku M.DC.XXIIII, dniá dwudziestego czerwca, to iest w octawę Swiętego Antoniego z Padwi. Przy tym list J. M. Páná hetmáná koronnego polnego do Krolá J. M. roku páńskiego 1624). Своеасаблівым дадаткам да “Дыярыўша…” з’яўляецца ліст кароннага гетмана, звернуты да караля. Апроч іншага, гетман распавядае Жыгімонту III пра дзіўны выпадак, які на ўласныя вочы не бачыў, але чуў пра яго ад вартых даверу рыцараў. Гутарка пра той самы крыж на небе, які ўтварыўся з дыму за спінамі ардынцаў. “<…> надзвычай вялікі крыж утварыўся і паўстаў за спінамі язычнікаў. І да таго крыжа, як мне распавядалі, мужна прабілася войска вашай каралеўскай міласці” (аркуш 12). Яшчэ раз адзначым тое, што змест дыярыуша амаль даслоўна ўзнаўляе інфармацыю з папярэдняга дакумента.

У варшаўскай друкарні каралеўскага тыпографа Яна Рассоўскага выходзіць улётка, назва якой нічым не адрозніваецца ад разгледжанага вышэй дакумента – “POGROM TATARSKI…”. Па сутнасці гэта той самы тэкст, праўда з двума невялікімі дадаткамі: “Рэестр Іх Мосцяў паноў валанцёраў” і “Рэестр мурз, якія былі ў войску паганскім”. Адзначым тое, што ў першым “Рэестры…” падаецца колькасць слуг пешых і конных, якія прыйшлі разам з панамі-рыцарамі на вайну. Указваюцца і конныя ўкраінцы – агульнай колькасцю каля 500 чалавек. Усяго ж,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

калі верыць "Рэестру…", пад рукой кароннага гетмана было 2600 кавалерыстаў і каля паловы тысячы пехацінцаў. Колькасць мурз – 15.

Усе прааналізаваныя вышэй дакументы ўказваюць адназначную прычыну нашэсця Буджакскай арды – прага Кантымір-мурзы да рабункаў. Аднак канстытуцыя лютаўскага сейма 1624 года ўказвае і іншую магчымую прычыну: помста султана за шматлікія гвалты, якія ўчынялі ўкраінскія казакі на тэрыторыі Атаманскай Порты. А, магчыма, падзеі лета – гэта адказ гвалтам на гвалт. Яшчэ Якуб Сабескі ва ўспамінах пра Хоцімскую вайну пісаў пра тое, што Асман II, убачыўшы, як гараць прыгарады Стамбула, прыйшоў у шаленства і даў загад войскам Кантымір-мурзы адплаціць Рэчы Паспалітай той самай манетай. Тады ўсё завяршылася трагедыяй пад Цацорай. Фактычна, становішча Канецпольскага летам 1624 года, як мы ўжо згадвалі, вельмі было падобным да становішча войск вялікага гетмана Жалкеўскага. І ў першым, і ў другім выпадку сілы былі няроўныя.

На надзвычайным сейме дэпутаты невыпадкова прынялі "Пастанову аб Хатняй абароне", змест якой быў надзвычай жорсткім у дачыненні да свавольных запарожцаў: "Нягледзячы на нашы забароны, нягледзячы на старыя нашы суворыя законы і цяперашнія канстытуцыі, наважылася шмат людзей свавольных, міма волі нашай, з харугвамі і знакамі вайсковымі ў колькасці немалой да дзяржаў іншых за кардон выходзіць. Зняважыўшы старшынства нашае над імі і адпрэчыўшы павагу да права паспалітага, вялікую шкоду і ўціск яны ўчыняюць падданым нашым і ўсялякім абывацелям робяць розныя прыкрасці ды крыўды <…>. Не чакаючы іншага нашага загада, кожны такога ipso facto infamis вольны злавіць і забіць impune, маёмасць яго рухомую забраць <…> Той жа баніта, які такога злодзея заб'е, ад баніцыі будзе вызвалены" [1, с. 4]. Адзначым, што ў інвентары канстытуцый сеймаў Рэчы Паспалітай, выдадзеным у 1733 г., у дачыненні да запарожцаў ужываецца тэрмін "лісоўчык": "Той баніта, які лісоўчыка ("Lisowczyka") забіў бы, ад баніцыі мусіў быць вольным".

Звернем увагу на тое, што нават ад баніцыі пазбаўляўся забойца дзяржаўнага злачынцы. Улічваючы тое, што баніцыя была ці не адным з самых суворых пакаранняў той эпохі, можна меркаваць аб ступені небяспекі, якая сыходзіла ад запарожцаў ("людзей свавольных").

Тэма супрацьстаяння Каралеўства і арды на ўкраінскіх землях працягваецца ў наступнай улётцы, якая мае назву "Праўдзівая рэляцыя разгрому язычнікаў пад Белай Царквой…" (Relácya Prawdziwa POGROMV POGANSTWA POD BIAŁĄ CERKWIĄ Roku 1626. dniá 7 Octobra szczęśliwie otrzymánego. PREZ IEGO MOSCI PANA STEPHANA CHMIELECKIEGO, CHORĄZEGO Woiewodztwa Bracławskiego, ktorego Pogánstwá z Murádyn, Sołtanem, w liczbie było Ośmdźieśiąt tyśięcy. Naywyżßemu Pánu niechay będźie cześć y chwałá, á to PRZEZ IANA DOBROCIESKIEGO miedzy ludzie podána. WE LWOWIE,W Drukárni Ianá Szeligi I. M. X. ARCYBISKVPA Lwowskiego Drukarzá). Прысвечаны гэты дакумент кіеўскаму ваяводзе і будучаму кароннаму канцлеру Тамашу Замойскаму. А вось



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

галоўным героем свайго рыфмаванага апавядання аўтар – Ян Дабрацескі – робіць брацлаўскага харунжага Стэфана Хмялецкага. Пра яго вядома тое, што ён, насуперак рыцарскаму гонару і загадам гетмана Жалкеўскага, вывеў свой аддзел з бою пад Цацорай, чым у каронных землях заслужыў рэпутацыю баязліўца. Праўда, усяго праз чатыры гады ён пасвяхова камандаваў правым крылом каралеўскіх войск пад Мартынавым. Дзеянні ж Хмялецкага пад Белай Царквой у 1626 г Дабрацескі характарызуе як вяршыню вайсковага майстэрства. І гэта не дзіва, бо татараў, калі верыць зместу ўлёткі, было каля 100 тысяч. У табары крымчакоў знаходзіўся таксама хан Міхмед III Герай. Хмелецкі ж меў пад рукой невялічкія атрады Вішнявецкіх, Заслаўскіх і Замойскіх, а таксама нязначны (каля "1000 юнакаў") аддзел запарожцаў на чале з гетманам Дарашэнкам.

Хмялецкі, апавядае аўтар дакумента, аб'яднаў войска і рушыў у бок ворага, а перад гэтым накіраваў да татарскага коша пад'езд на чале з ротмістрам Хацімірскім. Знайшоўшы брод, каралеўскае войска перайшло праз рэчку і наблізілася да арды. З вялікім жаданнем заслужыць славу Рэчы Паспалітай польскае і запарожскае рыцарства атакавала ворага. Вось як гэты момант падае Ян Дабрацескі:

*Пайшлі на ворага – скаланулася, захісталася зямля,*
*Трубы грымяць, рушніцы гаркочуць, звініць зброя,*
*Голас Хмялецкага разносіцца ва ўсе бакі, змушае*
*Да бою! Сонца высока ўзнялося, чырвоным палае,*
*Поле засеянае татарвой! Трупаў столькі, што жах!*
*Мала хто з паганцаў сышоў на ўласных нагах* (аркуш 13).

Пасля такога разгрому, даводзіць аўтар, татары марылі толькі пра ўцёкі. Не шукаючы броду, плылі яны на другі бераг Росі. Хмялецкі той самай ноччу рушыў далей і неўзабаве сутыкнуўся з яшчэ адным татарскім атрадам, пры якім было шмат палонных хрысціян. І зноў сармацкая зброя перамагла.

Ян Дабрацескі ўказвае на вялікую ролю запарожцаў у перамозе над татарамі ("Слаўнай перамогай аздобілі сябе палякі // Разам з казацкай мужнасцю, добрыя юнакі" (аркуш 15). Што надзвычай важна, бо ўсяго год назад каралеўскае войска на чале з гетманам Канецпольскім мусіла ваяваць з казакамі, змушаючы іх да пацыфікацыі [1, с. 142]. Тады пасля крывавай бітвы каралеўскаму войску ўдалося прымусіць, акрамя ўсяго іншага, запарожцаў адмовіцца ад марскіх паходаў і рабункаў турэцкага ўзбярэжжа. Значна зменшылася і колькасць рэестравых казакаў. Відавочна, Ян Дабрацескі спадзяваўся на тое, што мір з казакамі будзе трывалым.

## Літаратура

1. Ładowski, M. M. Inwentarz Konstytucyy koronnych W. X. Litewskiego od roku panskiego 1550 do roku 1683 / M. M. Ładowski. – Lipsk : Ex officinal weidmanniana, 1733. – 675 s.

2. Дневникъ похода противъ козаковъ запорожскихъ (1625) // Мемуары, относящіеся къ исторіи Южной Руси : вып. 1-2. – Кіевъ : Тип. Г. Т. Корчакъ-Новицкаго, 1890. – III, 192, 439 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова